# ПАМЯЦІ ВУЧОНАГА

## ЯЎГЕН РЫГОРАВІЧ РАДКЕВІЧ



3 студзеня 1999 г. пасля цяжкай працяглай хваробы памёр доктар філалагічных навук, прафесар, пісьменнік і журналіст Яўген Рыгоравіч Радкевіч.

Я.Р.Радкевіч нарадзіўся 3 кастрычніка 1937 г. у г.Сянно Віцебскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У час Айчыннай вайны разам з бацькамі быў у партызанскім атрадзе. Бацька загінуў у 1942 г.

У 1954 г. Я.Р.Радкевіч скончыў Сцяпянскую школу ў Мінскім раёне і паступіў у Інстытут народнай гаспадаркі, але ў хуткім часе пакінуў яго і паехаў па камсамольскай пуцёўцы ў Казахстан на цаліну. Там вучыўся ў Усць-Каменагорскім вучылішчы механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў трактарыстам і камбайнёрам на палетках Паўладарскай вобласці. У 1958 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. З 1960 г., не спыняючы вучобы, працаваў на Беларускім радыё. Быў ініцыятарам стварэння радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная". З 1971 па 1974 г. вучыўся ў аспірантуры БДУ на кафедры тэлебачання і радыёвяшчання. Абараніў кандыдацкую дысертацыю і з 1974 г. працаваў на факультэце журналістыкі. З 1978 па 1994 г. з'яўляўся загадчыкам кафедры тэлебачання і радыёвяшчання. Пад яго кіраўніцтвам кафедра рыхтавала высокакваліфікаваныя творчыя кадры для рэспубліканскага тэлебачання і радыёвяшчання.

У 1988 г. Я.Р.Радкевіч абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. У 1989 г. яму было прысвоена званне прафесара.

Я.Р.Радкевіч унёс значны ўклад у развіццё тэарэтычных праблем радыёжурналістыкі. Ім апублікавана звыш 60 навуковых прац па праблемах сучаснага тэлебачання і радыёвяшчання, распрацаваны дзесяткі навукова-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў факультэта журналістыкі. Пры яго ўдзеле выйшлі ў свет два шырока вядомыя падручнікі, падрыхтаваныя сумесна з кафедрай РТ МДУ імя М.В.Ламаносава, – "Основы радиожурналистики" (1984) і "Основы телевизионной журналистики" (1988).

Сярод яго манаграфічных прац значнае месца займаюць даследаванні: "Маладзёжная радыёпраграма" (1979), "Беларускае радыё. Гісторыя, перспектывы развіцця" (1983). Ён выдаў рэкамендацыі "Радыёперадача" (па курсу "Тэорыя і практыка радыёвяшчання"), "Увага! Мікрафон уключаны!" (навучальны дапаможнік для студэнтаў факультэта журналістыкі па спецкурсу "Сучасныя прынцыпы ўздзеяння радыё і тэлебачання на аўдыторыю") і інш. Актыўна ўдзельнічаў у друку, на радыё і тэлебачанні, горача прапагандуючы ідэю нацыянальнага адраджэння рэспублікі.

Друкавацца Я.Р.Радкевіч пачаў з 1966 г. Ён – аўтар кніг апавяданняў і аповесцей "Плытагоны" (1972), "Месяц Межань. Зіма на выратавальнай" (1976), "Горны мёд" (1982), аповесцей "Антаніна" (1979), "Пешшу праз Галактыку" (1984), раманаў "Суткі дзён" (1984), "Закон прыцягнення" (1990). Ён таксама аўтар кнігі публіцыстыкі "Камсамольская дынастыя" і іншых. Яго гуманістычныя творы, станоўча ацэненыя крытыкай і чытачом, годна служаць і сёння справе выхавання моладзі.

Я.Р.Радкевіч быў членам Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём, шматлікімі ганаровымі граматамі. У 1998 г. за шматгадовую плённую навукова-педагагічную і творчую дзейнасць і ў сувязі з 60-годдзем Я.Р.Радкевіч узнагароджаны Знакам "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь".

Яўген Рыгоравіч Радкевіч быў добразычлівым і жыццярадасным чалавекам, карыстаўся вялікай павагай і аўтарытэтам на факультэце журналістыкі, у работнікаў Беларускага радыё і тэлебачання, творчай інтэлігенцыі рэспублікі.

Светлая памяць аб Яўгену Рыгоравічу Радкевічу назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў і працаваў разам з ім, каму пашанцавала вучыцца ў яго.

**Калектыў кафедры тэлебачання і радыёвяшчання**

## РЫГОР ВАСІЛЬЕВІЧ БУЛАЦКІ



На 78-м годзе пайшоў з жыцця доктар гістарычных навук, прафесар, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР Рыгор Васільевіч Булацкі.

Р.В.Булацкі нарадзіўся ў вёсцы Мачулкі Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён у якасці штурмана авіяцыйнага палка ваяваў на многіх франтах. Быў цяжка паранены. Вайну закончыў 13 мая 1945 г. у Чэхаславакіі.

У 1951 г. скончыў БДУ, працаваў рэдактарам шматтыражнай газеты "Беларускі універсітэт". З 1961 г. загадваў кафедрай журналістыкі, а з 1963 г. працаваў дэканам філалагічнага факультэта. У 1967–1981 гг. – дэкан факультэта журналістыкі і загадчык кафедры гісторыі журналістыкі.

Р.В.Булацкі ўнёс вялікі ўклад у вывучэнне праблем гісторыі, тэорыі і практыкі айчыннай журналістыкі. Ён аўтар многіх манаграфій, у тым ліку "Печать Белоруссии в период завершения реконструкции народного хозяйства республики", "Оружием слова", "Первые рабселькоры Белоруссии", "Ленинской гвардии солдат", "Кузьма Чорны – публіцыст", "Вера Харужая – рэвалюцыянер, публіцыст", "Хрэстаматыя па гісторыі беларускай савецкай публіцыстыкі", "Гісторыя беларускай журналістыкі", звыш 200 навуковых артыкулаў.

Р.В.Булацкі выхаваў не адно пакаленне журналістаў, якія працавалі і працуюць ва ўсіх сродках масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь, краін СНД і далёкага замежжа. Пад яго навуковым кіраўніцтвам было абаронена каля 40 кандыдацкіх дысертацый.

Р.В.Булацкі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, "Знак пашаны", многімі медалямі і ганаровымі граматамі.

Светлая памяць аб Рыгору Васільевічу Булацкім назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў, з кім ён працаваў.

**Калектыў факультэта журналістыкі**